

fot. AFP/East News

# ЗЛАЧЫНСТВА Ў КУРАПАТАХ 1937–1941: **ПРАЎДА І СВАБОДА**

Польска-беларуская анлайн-канферэнцыя

**24 лютага 2021**

„Дзяды супраць тэрору” – пад такім лозунгам 1 лістапада 2020 года тысячы беларусаў маршавалі з Мінска ў Курапаты дзеля таго, каб ушанаваць ахвяры савецкіх злачынстваў і запратэставаць супраць рэпрэсій улады, якія скіраваныя сёння на беларускую апазіцыю. Службы парадку спрабавалі разбіць дэманстрацыю, быў выкарыстаны слезацечны газ, шумавыя гранаты і гумовыя кулі, было арыштавана больш за 300 чалавек, шмат хто з іх быў збіты. Удзельнікі ўрачыстасцяў, якім атрымалася дайсці да Курапатаў, усклалі кветкі і запалілі свечкі каля крыжоў, а таксама заспявалі песні. З бела-чырвона-белымі сцягамі ў руках яны стварылі жывы калідор, які вёў да цэнтральнага месца памяці.

Курапаты, урочышча на ўскраінах Мінска, з’яўляецца знакам камуністычных злачынстваў, скіраваных на беларускую інтэлігенцыю. Гэта менавіта там Саветы ў 1937–1941 гады расстралялі па розным ацэнкам ад 100 да 250 тыс. чалавек. У Курапатах забівалі таксама палякаў – ахвяры Польскай аперацыі НКУС, а таксама ахвяры Катыні. У Савецкім Саюзе пра камуністычны тэрор было забаронена прыгадваць, таму Курапаты былі выкрэсленыя з грамадскай памяці, таксама як і іншыя месцы масавых расстрэлаў. У 1988 годзе па-беларуску выйшаў артыкул, аўтарамі якога былі Зянон Пазьняк і Яўген Шмыгалёў, пад назвай *Курапаты – дарога смерці*, які ўпершыню закранаў тэму масавых забойстваў. Нягледзячы на тое, што прайшло столькі гадоў, злачынства ў Курапатах усё яшчэ чакае канкрэтнай навуковай працы – усё яшчэ не былі праведзены археалагічныя даследаванні, а дакументацыя застаецца схаванай у архівах. З аднаго боку Курапатам пагражае забыццё і замятанне слядоў злачынства, а з іншага – інструменталізм у рамках афіцыйнай дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. У той жа час апошнія падзеі выразна паказваюць, што памяць пра савецкі тэрор яшчэ жывая сярод беларусаў і робіцца істотнай кропкай адліку для тых, хто сёння патрабуе праўды і свабоды.

Супольная канферэнцыя Інстытута Пілецкага і Беларускага дому ў Варшаве будзе прысвечана масавым рэпрэсіям, якія зазналі беларусы і палякі з боку таталітарнай савецкай улады ў 1937–1941 гадах. Мэтай канферэнцыі з’яўляецца прэзентацыя актуальнага ўзроўню ведаў на тэму злачынства ў Курапатах, якое застаецца па-за галоўным напрамкам гістарычнай свядомасці палякаў, а ў Беларусі лепей вядома толькі ў цесных колах апазіцыі. Нам важна падкрэсліць агульны досвед беларусаў і палякаў у канфрантацыі з камунізмам. Мы хочам таксама падумаць пра ролю памяці аб Курапатах і – у шырэйшым аспекце – пра савецкі тэрор падчас суб’ектывізацыі беларускага грамадства і фармавання новай беларускай палітычнай свядомасці. Ці можа агульная гісторыя народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы быць падставай для паразумення і супрацоўніцтва? Якое значэнне мае досвед, звязаны з камунізмам, для высілкаў, скіраваных на фармаванне і пашырэнне прасторы свабоды і дэмакратыі ў нашым рэгіёне? Як увесці такую перспектыву ў галоўны напрамак еўрапейскай памяці?

**Гадзіны падзеі паводле беларускага часу (UTC+03:00)**

---

**11.00–11.45**

**Пачатак**

Войцех Казлоўскі (Wojciech Kozłowski) ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

Алесь Зарэмбюк ФОНД БЕЛАРУСКІ ДОМ

---

**12.00–14.00**

**I Панэльная дыскусія. Беларусы і палякі – ахвяры камунізму. Злачынства ў Савецкім Саюзе**

**Мадэратар**

Вольга Лебедзева (Olga Lebedewa) ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

**Дакладчыкі**

Аляксандр Смалянчук ІНСТЫТУТ СЛАВІСТЫКІ ПОЛЬСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

**Палітычныя рэпрэсіі ў БССР у 1920–1940-я гады: праблематыка даследаванняў**

Ніна Стужынская (Nina Stużyńska) ГІСТОРЫК І ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

**Трохвугольнік рэпрэсій у Мінску: турма, канцэнтрацыйны лагер, НК-ДПУ. 20-я гады XX стагоддзя**

Ігар Мельнікаў ГІСТОРЫК, ЛАЎРЭАТ УЗНАГАРОДЫ ІМ. ЛЬВА САПЕГІ Ў 2020 ГОДЗЕ

**Сталінскія рэпрэсіі на польска-савецкай мяжы ў 30-я гады XX стагоддзя**

Мацей Вырва (Maciej Wyrwa) ЦЭНТР ПОЛЬСКА-РАСІЙСКАГА ДЫЯЛОГУ І ПАРАЗУМЕННЯ

**Курапаты і нязнойдзеныя ахвяры катынскага злачынства**

---

**16.00–18.00**

**II Панэльная дыскусія. Прабуджэнне памяці: Курапаты ў гістарычнай свядомасці**

**Мадэратар**

Ежы Рагазінскі (Jerzy Rohoziński) ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

**Дакладчыкі**

Ігар Кузняцоў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**Месцы масавых злачынстваў і пахаванняў ва ўрочышчы Курапаты: праблемы, звязаныя з пошукам і ушанавання ахвяр савецкага тэрору**

Войцех Сьлешыньскі (Wojciech Śleszyński) МУЗЕЙ ПАМЯЦІ АДПРАЎЛЕНЫХ У СІБІР

**Памяць аб месцы злачынства ў Курапатах – як адна з асноў фармавання альтэрнатыўнага - у адносінах да постсавецкага – вобразу гісторыі Беларусі**

Павел Абламскі ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ ПОЛЬСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

**Курапаты – месца памяці ў гістарычнай свядомасці маладога пакалення беларусаў**

Вольга Лебедзева ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

**Ахвяры і выканаўцы: польская аперацыя НКУС у гістарычнай памяці**

**18.15–19.15**

**III Панэльная дыскусія. Адмова, тролінг, фэйкавыя навіны: як фальсіфікуецца гісторыя камунізму**

**Два галасы – польскі і беларускі**

Каміль Клысіньскі (Kamil Kłysiński) ЦЭНТР ПА ВЫВУЧЭННІ УСХОДУ

Зміцер Міцкевіч БЕЛСАТ ТВ І BELARUS SECURITY BLOG

**Мадэратар**

Анджэй Завістоўскі (Andrzej Zawistowski) ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

---

**20.00–21.30**

**IV Панэльная дыскусія. Сіла антыкамунізму. Гісторыя і палітычная суб'ектыўнасць у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе**

**Мадэратар**

Тамаш Стэфанэк (Tomasz Stefanek) ІНСТЫТУТ ПІЛЕЦКАГА

**Удзельнікі**

Аляксандр Мілінкевіч БЕЛАРУСКІ АПАЗІЦЫЙНЫ ДЗЕЯЧ, КАНДЫДАТ НА ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАХ У БЕЛАРУСІ Ў 2006 ГОДЗЕ

Андрэй Пачобут (Andrzej Poczobut) ЖУРНАЛІСТ, ДЗЕЯЧ ПОЛЬСКАЙ МЕНШАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

Агнешка Рамашэўска-Гузы (Agnieszka Romaszewska-Guzy) БЕЛСАТ ТВ TV

Павел Укельскі (Paweł Ukielski) МУЗЕЙ ВАРШАЎСКАГА ПАЎСТАННЯ

Organizatorzy

Instytut Pileckiego

BIAŁORUSKI DOM WARSZAWA

Partnerzy

Ministerstwo Kultury i Dziedzictwa Narodowego

БЕЛСАТ BELSAT

Fundacja Solidarności Międzynarodowej

Centrum Białoruskiej Solidarności

20 lat Kolegium Europy Wschodniej

OSW

Studium Europy Wschodniej Uniwersytet Warszawski

Muzeum Pamięci Sybiru

Instytut Europy Środkowej Institute of Central Europe

Instytut Literacki Fundacja Kultury Paryskiej

## АНАТАЦЫІ РЭФЕРАТАЎ

---

**д-р навук Аляксандр Смалянчук (Aleksander Smalianczuk)**

**Палітычныя рэпрэсіі ў БССР у 1920–1940-я гады: праблематыка даследаванняў**

Падчас выступу будзе прэзентаваны кароткі агляд даследаванняў над праблематыкай палітычных рэпрэсій у сучаснай беларускай гістарыяграфіі, яе канфрантацыі з афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіяй. У другой частцы рэферата аўтар сканцэнтруецца на недаследаваных аспектах гэтай праблематыкі і новых даследчых сферах. Аўтар таксама наблізіць праблему беларускай гістарычнай памяці аб злачынствах камуністычнага рэжыму.

---

**д-р Ніна Стужынская (Nina Stużyńska)**

**Трохвугольнік рэпрэсій у Мінску: турма, канцэнтрацыйны лагер, НК-ДПУ. 20-я гады XX стагоддзя**

Прадмет рэферата – гэта аналіз арганізаваных формаў палітычнага гвалту і функцыявання прылад рэпрэсій у савецкай Беларусі: НК-ДПУ, турмаў, канцлагераў і выпраўленча-працоўных калоній. У 20-я гады XX стагоддзі былі створаныя асновы заканадаўчых і маральных (антымаральных) змен для будучага неймавернага тэрору. Тады пачаўся працэс кансалідацыі ўлады, нішчыліся ўсе формы супраціву і пратэсту. Змены, якія адбываліся, знайшлі адлюстраванне ў лёсах прадстаўнікоў розных сацыяльных груп.

---

**д-р Ігар Мельнікаў (Ihar Mielnikau)**

**Сталінскія рэпрэсіі на польска-савецкай мяжы ў 30-я гады XX стагоддзя**

На мяжы 20-х і 30-х гадоў XX стагоддзя савецкія ўлады пачалі будаваць сістэму ўмацаванняў на мяжы з Польшчай, на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Гэта было звязана з пачаткам «ачысткі» памежнай зоны ад «непажаданых» элементаў. Пік гэтага працэсу прыйшоўся на 1937–1938 гады.

---

**д-р Мацей Вырва (Maciej Wyrwa)**

**Курапаты і нязнойдзеныя ахвяры катынскага злачынства**

Курапаты – гэта асаблівае месца, месца, дзе былі схаваныя астанкі ахвяр савецкіх рэпрэсій як з часоў Вялікага тэрору 1937–1938 гадоў, гэтак і з часоў Другой сусветнай вайны. У ямах смерці спачываюць побач целы прадстаўнікоў шматлікіх народаў і этнічных груп, у тым ліку беларусаў, габрэяў, рускіх, палякаў – грамадзянаў Савецкага Саюза і II Рэчы Паспалітай. Ці знайшлі ў Курапатах свой трагічны канец таксама і ўсё яшчэ безыменныя ахвяры катынскага злачынства, забітыя ў катавальнях НКУС у Мінску?

**д-р Ігар Кузняцоў (Ihar Kuzniacou)**

**Месцы масавых злачынстваў і пахаванняў ва ўрочышчы Курапаты: праблемы, звязаныя з пошукам і ушанавання ахвяр савецкага тэрору**

Рэферат будзе прысвечаны працэдуры экзэкуцыі і пахаванню ахвяр палітычных рэпрэсій у 30-я і 40-я гады XX стагоддзя на тэрыторыі Мінска і наваколля. Будзе разгледжана праблематыка крымінальнай справы, пачатай 14 чэрвеня 1988 года пракуратурай БССР, эксгумацыі, праведзенай спачатку ў 1988 годзе, а потым у 1997–1998 гадах вайсковай пракуратурай. Падчас выступу аўтар здзейсніць аналіз вынікаў даследаванняў, таксама паставіць тэзу, што Курапаты з'яўляюцца меркаваным месцам пахавання афіцэраў Войска Польскага, забітых у 1940 годзе, таксама закране пытанне, звязанае з пошукам і ўшанаваннем ахвяр савецкага тэрору.

**праф. д-р навук Войцех Сьлешыньскі (Wojciech Śleszyński)**

**Памяць аб месцы злачынства ў Курапатах – як адна з асноў фармавання альтэрнатыўнага ў адносінах да постсавецкага вобразу гісторыі Беларусі**

Ужо пад канец 80-х гадоў XX стагоддзя ўлады БССР з бояззю назіралі за інфармацыяй, якая паўсюдна прабівалася ў беларускае грамадства пра камуністычныя злачынствы ў Курапатах пад Мінскам. Шок выклікаў артыкул Зянона Пазняка, напісаны пры супрацы з Яўгенам Шмыгалёвым, азагалоўлены *Курапаты – Дарога смерці*, апублікаваны ў чэрвені 1988 года. Пасля 1991 года ў асяроддзі беларускіх гісторыкаў, якія выказваюцца за так званай нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыяй гісторыі, пытанне злачынстваў у Курапатах мела ключавую ролю. Гэта пазіцыя сустрэлася з адназначнай крытыкай постсавецкай грамадскасці. Пасля 1994 года яна стала галоўным тлумачэннем адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі. Нягледзячы на дзеянні дзяржаўных улад памяць пра савецкае злачынства ў Курапатах усё яшчэ з'яўляецца адной з найболей выразных ліній падзелу паміж прыхільнікамі нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гісторыі і грамадска-эканамічнай канцэпцыі (у гэты час беларускай дзяржаўнай ідэалогіі).

**Павел Абламскі (Pavel Ablamski)**

**Курапаты – месца памяці ў гістарычнай свядомасці маладога пакалення беларусаў**

Курапаты – як месца памяці было адкрыта ў спецыфічны час і ў спецыфічных умовах. Распад Савецкага Саюза быў для часткі беларусаў доўгачаканым вызваленнем з-пад савецкай каланіяльнай імперыі, а для іншых – самай вялікай катастрофай XX стагоддзя. У той жа час толькі невялікая частка беларускага грамадства разглядала злачынства ў Курапатах у кантэксце савецкай палітыкі

генацыду. Курапаты, якія разглядаліся з гэтай перспектывы, былі заснаваўчым момантам Беларускага Народнага Фронту. Кансалідацыя аўтарытарнага рэжыму Лукашэнкі спрыяла таму, каб аб Курапатах забыліся. Але ў той жа час памяць пра іх старанна культывавалася ў асяроддзі беларускай апазіцыі. Гістарычная свядомасць маладога пакалення беларусаў на сённяшні дзень выглядае як палімпсэст, у якім сутыкаюцца ўплывы абодвух кірункаў пра Курапаты.

**Вольга Лебедзева (Olga Lebedewa)**

**Ахвяры і выканаўцы: польская аперацыя НКУС у гістарычнай памяці**

Рэферат тычыцца гістарычнай памяці пра найбуйнейшай нацыянальнай аперацыі ў Савецкім Саюзе. Пераследванні палякаў здараліся таксама і раней, яшчэ перад Вялікім тэрорам. Кульмінацыйным момантам у рэпрэсіях НКУС была праведзеная ў 1937–1938 гадах польская аперацыя. Па ацэнках тады загінула больш за 100 тыс. палякаў, і амаль 30 тысяч было адпраўлена ў лагеры.

## БІЯГРАМА

**Павел Абламскі (Pavel Ablamski)**, гісторык, супрацоўнік Інстытута Гісторыі ПАН, у якім ён падрыхтоўвае доктарскую дысертацыю на тэму «Polityka narodowościowa państwa polskiego na Polesiu w latach 1921–1939 roku» (Нацыянальная палітыка польскай дзяржавы ў Палессі ў 1921–1939 гадах). Яго даследчыя інтарэсы складаюцца з праблематыкі нацыянальных меншасцяў і нацыянальнай палітыкі дзяржаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы ў міжваенны перыяд, а таксама з палітычнай і грамадскай гісторыі ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай.

**Каміль Клысіньскі (Kamil Kłysiński)**, палітолаг, выпускнік Інстытута палітычных навук і журналістыкі, а таксама ўсходазнаўства пры Усходнім Інстытуце на Універсітэце ім. Адама Міцкевіча ў Познані. З 2007 года ён працуе ў Цэнтры па вывучэнні Усходу, дзе адпачатку займаецца беларускай тэматыкай. У 2013–2016 гадах ён працаваў у дыпламатычным корпусе ў Консульстве РП у Вільнюсе. Сталы супрацоўнік «Новай Усходняй Еўропы». Пераклаў біяграфію Аляксандра Лукашэнкі, аўтарам якой з'яўляецца Валер Карбалевіч *Александр Лукашенко. Политический портрет* (2010; *Aleksandr Łukaszenko. Portret polityczny*, надрукаваную ў выдавецтве PISM у 2013 годзе).

**д-р Ігар Кузняцоў**, гісторык, звязаны з Томскім дзяржаўным універсітэтам, у якім абараніў доктарскую дысертацыю «Масавыя рэпрэсіі на тэрыторыі Заходняй Сібіры ў 1930-я гады і рэабілітацыя ахвяраў тэрору». У 1993–1998 гадах атрымаў званне дацэнта на кафедры Дыпламатычнай і консульскай службы Факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Член Міжнароднага гісторыка-асветніцкага дабрачыннага таварыства па абароне правоў чалавека «Мемарыял», а таксама Беларускай супольнасці журналістаў. Аўтар шматлікіх кніг, а таксама навуковых і публіцыстычных артыкулаў на тэму гісторыі савецкіх рэпрэсій.

**Вольга Лебедзева (Olga Lebedewa)**, гісторык, выпускніца Гістарычнага інстытута Варшаўскага ўніверсітэта, у гэты час аспірантка ў Факультэце навук пра культуру і мастацтва Варшаўскага ўніверсітэта. Займаецца праблематыкай гістарычнай памяці на прыкладзе музеяў посткамуністычных дзяржаў. Каардынатар Усходняй секцыі ў Архіўным Аддзеле Інстытута Пілецкага.

**Зміцер Міцкевіч (Zmicier Mickiewicz)**, журналіст Белсат ТБ, аналітык праекта «Belarus Security Blog». Выпускнік Факультэта Міжкультурных сувязяў Дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ў Мінску. Галоўны рэдактар альманаха «Varta», прысвечанага тэмам нацыянальнай бяспекі Беларусі. Сферы даследаванняў: інфармацыйная вайна і прапаганда, міжнародныя адносіны, супрацьдзеянні ў дачыненні тэрарызму.

**д-р Ігар Мельнікаў (Ihar Mielnikau)**, гісторык, спецыяліст у вобласці вайсковай гісторыі Беларусі, выпускнік Варшаўскага ўніверсітэта. Лаўрэат узнагароды ім. Вацлава Ластоўскага за папулярызацыю ведаў па гісторыі Беларусі (2014). Аўтар шматлікіх кніг пра міжваенны перыяд і Другую сусветную вайну, якія закранаюць праблематыку гісторыі польска-савецкай памежнай паласы: *Заходнебеларуская Атлантыда 1921–1941 гг.* (2014); *Мяжа ля Заслаўя 1921–1941 гг.* (2015); *Заходнебеларуская Атлантыда 1921–1941 гг. Паміж Варшавай і Масквой* (2016); *Яліна. Гісторыя ў 90 гадоў* (2016); *Забытыя героі. Жаўнеры з Беларусі ў Другім польскім корпусе і Першай польскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгадзе* (2017); *Адысея палешука* (2017); *Другая сусветная вайна на фотаздымках з архіва Ігара Мельнікава* (2018); *Верасень 1939 г. Магілы „неаб'яўленай вайны"* (2019); *На „мяжы цывілізацый". Старонкі гісторыі даваеннага савецка-польскага кардону ў Беларусі* (2020).

**д-р Аляксандр Мілінкевіч**, фізік, грамадскі дзеяч, палітык. Выпускнік Фізіка-матэматычнага факультэта Педагагічнага інстытута ў Гродне. Навуковы супрацоўнік беларускіх і замежных адукацыйных устаноў. У кастрычніку 2005 года быў абраны ў якасці супольнага кандыдата дэмакратычных кругоў на пасаду прэзідэнта Беларусі. Годам пазней атрымаў ад Еўрапейскага Парламента ўзнагароду ім. Андрэя Сахарава. У 2006–2016 гадах кіраваў рухам «За Волю». Аўтар шматлікіх навуковых прац і манаграфій у вобласці фізікі, гісторыі, культуры, утварэння і архітэктуры Беларусі. Пад канец 80-х гадоў XX стагоддзя знайшоў у Воўчыне магілу апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

**Андрэй Пачобут (Andrzej Poczobut)**, журналіст, публіцыст і блогер, звязаны з Гродна, дзеяч польскай меншасці ў Беларусі. У 1999–2001 гадах быў выкладчыкам права ў Гарадзенскім дзяржаўным політэхнічным Каледжы, а таксама ў Тэхнікуме Права і бізнесу. Потым заняўся журналісцкай дзейнасцю. У тым ліку працаваў у гарадзенскіх газетах «Пагоня», «Дзень», «Мясцовы час», «Голас над Нёманам», а таксама ва ўсебеларускім незалежным штодзённіку «Народная воля». Займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса Саюза палякаў у Беларусі «Magazyn Polski na Uchodźstwie». З 2006 года з'яўляецца карэспандэнтам «Gazeta Wyborcza» у Гродне. Актыўны член Саюза палякаў у Беларусі. Аўтар кнігі *System Białoruś* (2013, Сістэма Беларус).

**д-р Ежы Рахачыньскі (Jerzy Rohoziński)**, гісторык, антраполаг культуры, ад'юнкт у Інстытуце Пілецкага. Доктар гуманітарных навук. Цікавіцца грамадска-рэлігійнай гісторыяй царскай Расіі і СССР. Аўтар кніг: *Święci, biczownicy i czerwoni chanowie. Przemiany religijności muzułmańskiej w radzieckim i poradzieckim Azerbejdżanie* (2005, Святыя, флагеланты і чырвоныя ханы. Змены ў мусульманскай рэлігійнасці ў савецкім і постсавецкім Азербайджане); *Bawełna, samowary i Sartowie. Muzułmańskie okrainy carskiej Rosji 1795–1916* (2014, Бавоўна, самавары і сарты. Мусульманскія ўскраіны царскай Расіі 1795–1916); *Początki państw. Gruzja* (2016, Станаўленне дзяржаў. Грузія); *Narodziny globalnego dżihadu* (2017, Зараджэнне глабальнага джыхаду), а таксама *Najpiękniejszy klejnot w carskiej koronie. Gruzja pod panowaniem rosyjskim 1801–1917* (2018, Самая выдатная жамчужына ў царскай кароне. Грузія пад расійскім панаваннем 1801–1917). Неўзабаве выйдзе ягоная кніга пра палякаў у Казахстане.

**Агнешка Рамашэўска-Гузы (Agnieszka Romaszewska-Guzy)**, рэпарцёр і тэлевізійны журналіст, стваральнік і дырэктар Белсат ТБ, незалежнага тэлевізійнага канала, які выходзіць у эфір у Беларусі. Падчас навучання ў Варшаўскім універсітэце актыўна брала ўдзел у Незалежным саюзе студэнтаў (NZS). Пасля ўвядзення ваеннага становішча інтэрнавалася. Да 1989 года супрацоўнічала з апазіцыйнымі коламі, у тым ліку з рухам «Воля і свет». З 1992 года звязаная з Польскім тэлебачаннем (TVP), дзе працавала, напрыклад, у якасці міжнароднага карэспандэнта, дырэктара групы рэпарцёраў, а таксама намесніка дырэктара галоўных Навін. Таксама яна выконвала абавязкі дырэктара тэлевізійнага канала «TVP Polonia» і «TVP Białystok». Уваходзіць у склад Саюза польскіх журналістаў, у якім выконвала функцыю намесніка старшыні, а таксама ўваходзіла ў склад кіравання Еўрапейскай федэрацыі журналістаў.

**д-р навук Аляксандр Смалянчук (Aleksander Smalianczuk)**, гісторык, прафесар Інстытута славістыкі Польскай акадэміі навук, а таксама прафесар, які інспектуе Варшаўскі ўніверсітэт. Займаецца гісторыяй нацыянальных рухаў у Беларусі і Літве ў XIX–XX стагоддзі, палітычнай гісторыяй Беларусі ў XX стагоддзі, гістарычным горадабудаўніцтвам, вуснай гісторыяй. Аўтар манаграфіі *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-люты 1917* (2004); *Краёвая ідэя ў беларускай гісторыі* (2017); *Раман Скірмунт (1868–1939). Жыццяпіс грамадзяніна Краю* (2018). Галоўны рэдактар «Homo Historicus. Штогодніка антрапалогіі гісторыі» (з 2018 года) і штогодніка Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта «Acta Albaruthenica» (з 2020). Суаўтар Інтэрнэт-праекта «Беларускі архіў вуснай гісторыі». Член кіраўніцтва Камітэта беларускага гістарычнага таварыства (Мінск–Гродна–Беласток), член рады Інстытута Вялікага Княства Літоўскага (Каўнас).

**Тамаш Стэфанэк (Tomasz Stefanek)**, гісторык ідэй, музейнік. Ужыццяўляў даследчыя, адукацыйныя і выставачныя праекты пры супрацоўніцтве з Музеем Варшаўскага паўстання і Музеем гісторыі Польшчы. Адзін са стваральнікаў сталай выставы Музея эміграцыі ў Гдыні. Аўтар выбару публіцыстыкі Тамаша Мэрты *Nieodzowność konserwatyzmu. Pisma wybrane* (2011, Патрэба кансерватызму. Абранае), а таксама зборы эсэ *Być albo nie być. Szkice o podmiotowości* (2016, Быць або не быць. Нарысы пра суб'ектыўнасць). Публікаваўся ў тым ліку ў «Teologia Polityczna», «Rzeczpospolita» і «Polska The Times». Працуе ў Інстытуце Пілецкага.

**д-р Ніна Стужынская (Nina Stużyńska)**, гісторык і грамадскі дзеяч, выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Атрымала доктарскае званне ў Дзяржаўнай акадэміі навук. Працавала ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук (1984–2003), адкуль была звольнена па палітычных матывах. Прайшла шматлікія стажаванні ў беларускіх і замежных інстытутах. Звязана з Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыяй, у якой была намеснікам старшыні ў 1998–2003 гадах, а таксама з Беларускай жаночай лігай з 1998 года.

**праф. д-р навук Войцех Сьлешыньскі (Wojciech Śleszyński)**, гісторык, з 2017 года дырэктар заснаванага ў Беластоку Музея памяці адпраўленых у Сібір. Шматгадовы выкладчык Універсітэта ў Беластоку, дэкан гісторыка-сацыялагічнага факультэта. Аўтар шматлікіх навуковых і папулярна-навуковых публікацый аб Усходніх крэсах II Рэчы Паспалітай ці аб савецкай акупацыі 1939–1941 гадоў.

**д-р Павел Укельскі (Paweł Ukielski)**, палітолаг, ад'юнкт у Аддзеле Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы Інстытута палітычных вывучэнняў Польскай акадэміі навук (PAN), намеснік дырэктара Музея Варшаўскага паўстання ў 2004–2014 гадах і з 2016 года. У 2014–2016 гадах намеснік старшыні Інстытута нацыянальнай памяці (IPN), з 2011 года член улад Платформы еўрапейскай памяці і сумлення. Выкладчык у Collegium Civitas (2002–2014) і Graduate School for Social Research (з 2020). Аўтар у тым ліку збору тэкстаў *Pamięć Polski, pamięć sąsiadów. Pamięć Europy* (2020, Памяць Польшчы, памяць суседзяў. Памяць Еўропы), суаўтар манаграфіі *1989 – Jesień Narodów* (2009, 1989 – Восень народаў; румынскае выданне 2013, вугорскае 2014, ангельскае 2020).

**д-р Мацей Вырва (Maciej Wyrwa)**, гісторык, супрацоўнік Цэнтра польска-расійскага дыялогу і паразумення, каардынатар праектаў «Лёс грамадзянаў Польшчы пад савецкай уладай пасля 17 верасня 1939 года», а таксама «Польская аперацыя НКУС. Ахвяры, дакументы». Аўтар у тым ліку публікацый *Nieodnalezione ofiary Katynia? Lista osób zaginionych na obszarze północno-wschodnich województw II RP od 17 września 1939 do czerwca 1940* (2015, Нязнойдзеныя ахвяры Катыні? Спіс зніклых на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводстваў II РП з 17 верасня 1939 па чэрвень 1940). Спецыялізуецца ў даследаваннях гісторыі савецкіх рэпрэсій у адносінах да палякаў, а таксама праблематыкі гістарычнай памяці.

**д-р навук Анджэй Завістоўскі (Andrzej Zawistowski)**, гісторык, прафесар Варшаўскай школы эканомікі, спецыялізуецца ў эканамічнай, грамадскай і палітычнай гісторыі XX ст. Супрацоўнік Кафедры эканамічнай і грамадскай гісторыі Варшаўскай школы эканомікі і Інстытута Пілецкага. У 2012–2016 гадах дырэктар Бюро грамадскай адукацыі Інстытута нацыянальнай памяці (IPN), а ў 2017–2020 гадах начальнік Гістарычнага аддзела Музея Варшаўскага паўстання. Аўтар некалькіх сотняў навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, у тым ліку манаграфій і падручнікаў. Адзін са стваральнікаў навукова-папулярнага гістарычнага штомесячніка «Pamięć.pl».